Варшаўскі, Д. Пётр Міхайлавіч Раманоўскі / Д. Варшаўскі // Аршанская газета. – 2023. – 26 жн. – С. 8.

## ПЁТР МІХАЙЛАВІЧ РАМАНОЎСКІ


Пётр Раманоўскі

Беларускі жывапісец нарадзіўся 21 верасня 1919 года ў Оршы. У1934–1938 г. вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы. Пасля яго заканчэння накіраваны ва Усерасійскую Акадэмію мастацтваў. У 1938–1948 г. вучыўся на . жывапісным факультэце Інстытута скульптуры і архітэктуры ВАХ у А. А. Асьмёркіна і С. Л. Абугава (дыпломная карціна – «Генерал Чарняхоўскі», прысвоена кваліфікацыя мастака жывапісу). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны медалямі.

У 1948–1954 г. працаваў выкладчыкам у Мінскім мастацкім вучылішчы. З 1949 г. браў удзел у рэспубліканскіх выставах. Член Союза мастакоў СССР.

У пачатку творчай дзейнасці стварыў шэраг кампазіцый на гісторыка-рэвалюцыйную тэму. Працаваў таксама ў галіне жанравай карціны, партрэта, пейзажа. Асноўныя творы: «Сяброўкі» (1951), «Уборка капусты» (1958), «З дзядзькам на рыбалцы» (1959), «Партрэт горнага майстра Т. П. Архіпенкі», «Партрэт рабочага Ю. Іванова» (1963). Узнагароджаны ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Жыў і працаваў у Мінску.

Памер Пётр Міхайлавіч 23 верасня 1977 года. Некаторыя яго работы знаходзяцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі.

**Д. ВАРШАЎСКІ**


Карціна «Інтэр'ер»